**Занатак па адукацыйнай вобласці “Развіццё маўлення і развіццё маўленчых зносін”з выхаванкай сярэдняга дашкольнага ўзросту, якая навучаюцца і выхоўваецца па вучэбным плане спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення**

**Тэма:** Развіццё ўмення разумець мнагазначнасць слоў.
**Праграмны змест**: развіваць уменне разумець мнагазначнасць слоў, пазнаёміць з мнагазначным словам “коцікі”. Папаўняць актыўны і пасіўны слоўнік назоўнікаў, развіваць уменне дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў у родзе, ліку, склоне. Папаўняць веды аб навакольным асяроддзі. Развіваць зрокавую, слыхавую ўвагу і памяць, агульную, дробную маторыку, мысленне, графічныя навыкі. Выхоўваць цікавасць да беларускай мовы, мастацкага слова.
**Абсталяванне:** цацка кот, сапраўдная галінка вярбы, мяч, малюнкі квітнеючай вярбы, малюнак з вясновым пейзажам, аркуш паперы з намаляванай пункцірнай лініяй галінкаю вярбы з “коцікамі”.

**Ход занятку:**

1. Арганізацыйны момант. Стварэнне эмацыянальна камфортнага стану, пазітыўнага настрою.
Педагог: Добры дзень, я рада вітаць цябе! Давай прывітаемся з нашымі гасцямі. Сёння, калі я ішла ў дзіцячы садок, я атрымала незвычайны ліст. Паслухай , што у ім напісана:
“Добры дзень! Я сёння збіраюся да вас у госці. Хутка буду.”
Педагог: Усё, больш нічога няма. А ты, Маша не ведаешь, хто збіраецца да нас у госці? Пачакай, пачакай, тут на адваротным боку напісана : “ Адгадайце пра мяне загадку , і я тут жа з’яўлюся”. Давай паспрабуем адгадаць загадку і даведаемся, што гэта за госць.
Педагог чытае загадку:
Хто зялёнымі вачамі,
Грозна бліскае начамі,
Мае пухленькія лапкі,
Мае кіпцікі-царапкі.
Спінку прутка выгінае,
Страх на мышак наганяе.
(Адказ дзяўчынкі). (Гучыць мяўканне ката)
Педагог: Так, гэта сапраўды кот. Ён завітаў да нас у госці.
Кот: Добры дзень, мае дараженькія! Правільна ты, Маша, адгадалапра мяне загадку. Адкажы яшчэ, калі ласка, а як называюць мяне ласкава? (Адказ дзяўчынкі). Што я люблю рабіць? Ці люблю я грэцца на сонцы?

Якога колеру бываюць каты? Ці ёсць у цябе кот або кошка? Як яе завуць? Раскажы мне пра яе. (Адказ дзяўчынкі).
Педагог:Так, сапраўды, каты вельмі любяць грэцца на сонейку, ляжаць, муркаюць, варкочуць. Таму часам катаў называюць коцікі-варкоцікі. Пра гэта нават напісалі верш. Паслухай:
Коцік-варкоцік,
Лёг на жывоцік,
Лапкі пад спінку,
Не трэба пярынка.
Кот: Так, так, я вельмі люблю грэцца на сонейку, люблю, калі мяне гладзяць. Дакраніся да мяне і раскажы які я на вобмацак? (Адказ дзяўчынкі).
Педагог: Так, сапраўды наш коцік мяккі, пушысты, ласкавы, футра ў яго, нібы шаўковае.
Педагог: Сядай коцік і паслухай разам з Машай наступны верш.
На вярбе –галінкі,
На галінке-коцікі,
Беленькія спінкі,
Беленькія хвосцікі.
Кот: Неправільны верш, так не бывае..
Педагог: Пачакай, кот, не спрачайся. Паглядзі, разам з Машай на галінку. Я наўмысне яе прынесла (прапаную дзяўчынке галінку вярбы з кветкамі -“коцікамі”) . Бычыш –гэта кветкі вярбы, або па-іншаму іх называюць “коцікі”. Вярба квітнее адна з першых дрэў. Перш у вярбы з’яўляюцца кветкі “коцікі”, а потым лісточкі. Якога колеру “коцікі”? (Адказы дзяўчынкі). Вось чаму пра ніх гавораць, што ў ніх “беленькія спінкі і беленькія хвосцікі”.
Педагог: Як ты , Маша лічыш, чаму кветкі вярбы назвалі “коцікамі”? (Адказы дзяўчынкі).
Педагог: Так, яны сапраўды пушыстыя, мяккія, беленькія. Як сапраўдныя коцікі.
Кот: Я не запомніў, так калі з’яўляюцца коцікі на вярбе.
(Адказ дзяўчынкі).
Педагог: Правільна, Маша, коцікі з’яўляюцца на вярбе ўвесну. дакладней ранняй вясной. Паглядзі на малюнак ранняй вясны, на ім намалявана вярба з коцікамі. Пра гэта напісала паэтэса Данута Бучэль-Загнетава:
Коцікі спал у цесных каморках.
Ды ручаінкі звіняць на пагарках.
Коцікі селі на кусцік вярбовы,
Грэюць на сонцы белыя бровы.

Педагог: А у якіх цесных каморках спалі коцікі? (Адказ дзяўчынкі).
Коцікі былі ў пупышках (паказваю на галінке вярбы пупышкі), а калі пачаў раставаць снег, зазвінелі ручаі, пупышкі распусціліся і з'явіліся кветкі- коцікі на вярбе. Надыходу вясны спрыяе соней, давай пра яго раскажам.
(Дзяўчынка разам з педагогам выконвае лагарытмічнае практыкаванне "Сонца спіць")
Сонца спіць, неба спіць, (дзяўчынка сядзяць на кортачках, апусціўшы
Нават вертык не шуміць. галаву)
Раніцаю сонца ўстала, (дзяўчынка ўстаюць, паднімаюць рукі уверх і разводзяць іх ў бакі)
Усім праменьчыкі паслала. (выпрастоўвае рукі ўперад, раскрывая далоні)
Ветрык тут падзьмуў, (робіць нахілы ў бакі)
Хмарай неба зацягнуў, (рукамі ў паветры малюе хмару)
Дождж па стрэсе грукаціць (пальцамі імітуе ўдары кропель)
У желабок вада бяжыць. (бягжыць па крузе)
Педагог: Адпачылі, сядай за стол, працягнем далей разам з катом разглядаць нашу галінку вярбы з коцікамі. Адкажы, Маша, а ці на самой справе ў коцікаў , якія растуць на вярбе ёсць бровы, спінкі, хвосцікі? (Адказы дзяўчынкі).
Педагог:Не. Паэтэса піша так піша пра ніх таму, што коцікі на вярбе пушыстыя, мяккія, нібы жывыя. Таму, хздаецца, што ў ніх ёсць і хвосцікі, і спмнкі, і бровы.
Педагог: Паслухай, Маша, слова адно "коцікі", але абазначае гэта слова два розныя прадметы: коцікі –свойскія жывёлы і коцікі – кветкі вярбы. Калі адно слова абазначае некалькі розных прадметаў, то пра гэта слова гаворвць, што яно мнагазагачнае, то есць слова мае многа значэнняў.
Кот: Я ўважліва слухаў і зразумеў, што каб даведацца, што абазанчае слова "коцікі", трэба ўваждіва слухаць увесь тэкст. Тады мы будзем ведаць пра што ідзе гаворка пра свойскую жывёлу. Або пра кветкі вярбы.
Педагог: Паслухай, Маша, вершы і паспрабуй здагадацца і адказаць пра што ў ім ідзе гаворка.

Коцік-варкоцік,
Лёг на жывоцік,
Лапкі пад спінку,
Не трэба пярынка. (Адказы дзяўчынкі).

Педагог: Так, сапраўды, у гэтым вершы гаворка ідзе пра свойскую жывёлу.

На вярбе –галінкі,
На галінке-коцікі,

Беленькія спінкі,
Беленькія хвосцікі. (Адказы дзяўчынкі).
Педагог: Маладзец, Маша, правільна здагадалася. Што ў гэтым вершы гаворка ідзе пра кветкі вярбы.
Што гэта коцікі, мяккія жывоцікі,
Грэюцца пв парозе, мяўкаюць на дарозе. (Адказы дзяўчынкі).
Педагог: Правільна, Маша. Гэта свойскія жывёлы.
На вярбіне коцікі-беленькія роцікі,
Лапачкі пуховыя, спіначкі шаўковыя. (Адказы дзяўчынкі).
Педагог: Ты , Маша, адказала правільна, гэта кветкі вярбы.
Кот: Дзякуй вам, за тое, што растлумачылі, што адно слова можа абазначаць некалькі розных прадметаў, адно дапамятаваў. Як такія словы называюцца. Дапамагі мне Маша, успомніць?
(Адказы дзяўчынкі).
Педагог: Так, такія словы называюцца мнагазначныя. Я цяпер я прапаную ўзяць аркуш паперы і па пункцірным лініям абвесці галінку вярбы.
(Дзяўчынка выконкае заданне, педагог на працягу гэтага часу замацоўвае назвы кветак вярбы)
Заключная частка.
Педагог: Пра якое слова мы сёння вялі размову? Чым гэта слова адрозніваецца ад іншых? Што гэта слова можа абазначаць? Што трэба рабіць, каб зразумець пра што ідзе гаворка? Штотабе спадабалася на занятку і што ты запомніла? (Адказы дзяўчынкі).
Педагог:Мне было цікаа с табой займацца, дзякуй за старанасць і правільныя адказы , да сустрэчы.
Кот: Да сустрэчы, мяў..!